**Анатоль Мяснікоў**
(Мінск)

## Беларусізацыя як дзяржаўная палітыка ў 20-я гады XX стагоддзя

Не адно стагоддзе беларус выношваў мару і надзею на рэалізацыю сваіх хрысціянскіх і гістарычных каштоўнасцяў. Сярод гэтых каштоўнасцяў некалькі асабліва значных і важкіх. Гэта — дзяржаўнасць і незалежнасць, мова і нацыянальна-культурная спадчына. Яны — асноватворныя, бо вызначаюць найперш твар кожнага народа, кожнай нацыі. Здзейсніць, ажыццявіць свае ідэалы і памкнуўся беларускі народ у тыя далёкія, гістарычныя для нас дваццатыя гады.

Рэальны шлях незалежнага дзяржаўнага і нацыянальнага развіцця адкрыўся перад беларусамі ў першыя ж дні 1919 года — з абвяшчэннем Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Але ж які гэта быў прывід, а калі дакладней — падман для цэлага народа! Неўзабаве, як вядома, адбыўся адыход значнай часткі беларускіх земляў да Расійскай Федэрацыі, а потым мела месца ўтварэнне штучнага, надуманага дзяржаўна-тэрытарыяльнага аб'яднання — Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Аднак ужо напрыканцы жніўня таго ж 1919 года трапіў пад акупацыю апошні павятовы цэнтр ЛітБела — Зарасай, бальшавікоў і ўрад ЛітБела прытуліў Смаленск і на гэтым, па-сутнасці, дзяржаўнае ўтварэнне, на якое бальшавіцкія ўлады рабілі вялікую стаўку, спыніла сваё існаванне. Дзяржаўная незалежнасць Беларусі, так і не нарадзіўшыся, сканала.

І вось надышлі тыя гістарычныя дваццатыя гады.

Тады, у 1920-я гады, уплыў, уздзеянне і ціск Расійскай Федэрацыі на Беларусь быў, на нашу думку, ці не самы моцны, катэгарычны і безапеляцыйны. І гэта пры тым, што праблемы нацыянальна-культурнага развіцця былі нібыта і аддадзены Беларусі для самастойнага вырашэння і рэалізацыі. Але ж цісну ў (ды яшчэ як!) так званы ўсеагульны (на думку бальшавікоў — ледзь ці не сусветны) сацыялістычны грунт, супрацьстаяць якому не было дазволена нікому!

Аднак стомлены першай сусветнай і грамадзянскай войнамі беларус спакваля пачынаў адчуваць сябе чалавекам. Ідэі барацьбы за права на прыстойнае жыццё, свабоду і імкненне да шчасця ўсё больш і больш станавіліся зразумелымі і блізкімі і грамадству ў цэлым, і многім людзям у прыватнасці. Гэтыя ідэі, уласна кажучы, маглі і павінны былі стаць асноватворнымі ў фарміраванні, усталяванні і развіцці беларускай нацыянальнай ідэі ўвогуле, якой як тады, у 1920-я гады, так і зараз, напрыканцы дваццатага стагоддзя, нам, беларусам, так не ставала і не стае.

Так ужо распарадзілася сама гісторыя, што той час даў ідэі беларусізацыі сваіх носьбітаў і песняроў. Карусь Каганец, Аляксандр Уласаў, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Вацлаў Ластоўскі, браты Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Іваноўскі, Ўсей Канчар, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Усевалад Ігнатоўскі, Аляксандр Цвікевіч, Зміцер Жылуновіч, Аляксандр Чарвякоў, Яўхім Карскі, Максім Гарэцкі, Аркадзь Смоліч і многія іншыя спачатку падрыхтавалі глебу, а потым і непасрэдна ўзначалілі працу па ажыццяўленні нацыянальных ідэалаў. У новых гістарычных умовах яны разам з сотнямі і тысячамі паплечнікаў і аднадумцаў актыўна ўзяліся найперш за распрацоўку нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага шляху Беларусі, пачалі пошук напаўнення жыцця нацыянальнымі адметнасцямі, новым жыццёвым успрыняццем, адпаведным часу і рэальнасці.

Рэальную сітуацыю на сваёй Бацькаўшчыне нашы адраджэнцы бачылі і выразна разумелі. Бачылі і разумелі найперш тое, што Маскву не перайначыш, не пераканаеш, не ўгаворыш на тыя ці іншыя канкрэтныя ўступкі. Дзяржаўная ўлада для таго і захоплівалася бальшавікамі-ленінцамі, каб дыктаваць і спавядаць так званы „новы свет”, у якім „кто был никем, тот станет всем”. Хто і кім стаў — мы сёння ведаем. Таму нібы прадчуваючы напал змагання за беларусізацыю, за беларускасць, нашы адраджэнцы пайшлі ў першую чаргу ў масы, каб павесці там асветніцкую і культурную работу. Іх галоўнай задачай стала тады далучэнне беларускага народа да сваёй гістарычнай спадчыны, сваіх традыцый і звычаяў.

Расійская імперыя, паводле трапнага вызначэння самога Леніна, уяўляла сабой „турму народаў”. Вырвацца з яе засценкаў у дваццатыя гады і паспрабаваў наш народ праз ажыццяўленне беларусізацыі як дзяржаўнай палітыкі — сваёй палітыкі, уласнай і па-сапраўднаму незалежнай. На нашу думку тады, у 1920-я гады, „турма народаў” і сапраўды магла рухнуць.

Дваццатыя гады сталі для Беларусі сапраўдным выклікам гісторыі. Сам час прад'явіў нашаму народу магчымасць на выпрабаванне беларускай нацыянальнай годнасці і гордасці. Беларусы атрымалі нарэшце рэальную магчымасць пастаяць за сваё, як казаў некалі Кастусь Каліноўскі, „чалавечае і народнае права, за сваю веру, за зямлю сваю родную”[1]. Ці скарысталі мы тое? Ці змаглі пастаяць за сябе?

Як і кожная грамадская, палітычная, сацыяльная з'ява ў жыцці чалавецтва ў цэлым ці канкрэтнага народа — у прыватнасці, беларусізацыя мела свае карані, вытокі, сваю перадгісторыю. Але тут варта, безумоўна ж, даць кароткае вызначэнне беларусізацыі як з'явы. На нашу думку, беларусізацыя — гэта дзяржаўная нацыянальна-культурная палітыка, скіраваная на фарміраванне, станаўленне і развіццё нацыянальных інтарэсаў карэннага насельніцтва Беларусі, стварэнне ўмоў для суверэннага незалежнага развіцця, адраджэнне беларускай нацыі праз росквіт нацыянальнай культуры, мовы, асветы, аднаўленне гістарычнай спадчыны, духоўных каштоўнасцяў і традыцый беларускага народа.

Карані беларусізацыі — у гісторыі шматвяковага змагання нашага народа з агрэсіўнымі, больш магутнымі і моцнымі, суседзямі за сваю незалежнасць і самастойнае жыццё. Вытокі ж яе, як трапна заўважыў беларускі гісторык Аляксей Кароль, „у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху, у ідэях беларускага нацыянальнага Адраджэння, выкрышталізаваных інтэлігенцыяй і сфармуляваных у праграмах беларускіх нацыянальных дэмакратычных і сацыялістычных партый”[2], якія асабліва праявілі сябе ў першыя два дзесяцігоддзі дваццатага стагоддзя.

Колькі б часу не мінула, хто і як бы не ацэньваў нашу шматпакутную гісторыю, безумоўна ж трэба, проста неабходна даць аб'ектыўную, справядлівую ацэнку дзейнасці тых людзей, грамадскіх, палітычных і партыйных (так, і партыйных таксама!) дзеячаў, якія ў дваццатыя гады шчыра і сумленна папрацавалі на беларусізацыю, на наша нацыянальнае Адраджэнне. Ужо тады, як вядома, партыя

[1] Кастусь Каліноўскі, *Ліст з-пад шыбеніцы*, [у:] *Беларуская літаратура XIX ст.*, Мінск 1988, с. 231.

[2] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі*, т. 1. Мінск 1993, с. 348.

бальшавікоў аднаасобна кіравала краінай і саюзнымі рэспублікамі, была так званай „кіруючай і накіроўваючай сілай" грамадства. Так ужо атрымалася, што амаль 20 гадоў Беларуссю кіравалі прысланыя з Масквы лідэры небеларускай нацыянальнасці, аднак некаторыя з іх — В. Кнорын, В. Багуцкі, А. Асаткін-Уладзімірскі, А. Крыніцкі, Я. Гамарнік — у аснoўным станоўча ўспрымалі беларусізацыю як палітыку нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Некаторыя з іх самі карысталіся і шырока прапагандавалі беларускую мову, свядома і актыўна заклікалі наш народ да суверэннага незалежнага развіцця і наогул у аснову ўсёй работы ставілі нашы нацыянальныя інтарэсы.

Такім чынам, беларусізацыя ўспрымалася Камуністычнай партыяй (бальшавікоў) Беларусі як заканамерная з'ява, улічвалася пры распрацоўцы яе нацыянальнай праграмы шырока і грунтоўна. І адсюль, варта прызнаць, яе, беларусізацыі, вялікі поспех у справе ажыццяўлення і рэалізацыі. Так, ужо ў першым важным і актуальным дзяржаўным дакуменце — Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ад 31 ліпеня 1920 года — Беларусь названа „краінай беларускіх, расійскіх, польскіх і жыдоўскіх рабочых ды сялян"[3]. Больш таго, Дэкларацыя ўстанаўлівала „поўную раўнапраўнасць моў (беларускай, расійскай, польскай, жыдоўскай) у зносінах з дзяржаўнымі ўстановамі і ў арганізацыях ды ўстановах народнай асветы і сацыялістычнай культуры"[4]. „Усе далейшыя пастановы Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада сцвярджаюць гэтыя дэкларацыі, робяць пастановы, якія практычна і больш дэтальна абгаварваюць гэтае пытанне, разглядаюць перашкоды, высвятляюць шляхі ды мерапрыемствы для забеспячэння фактычнай магчымасці працоўных усіх нацыянальнасцей карыстацца заваёвамі рэвалюцыі", — пераконваў старшыня ЦВК БССР Аляксандр Чарвякоў у артыкуле „За Савецкую Беларусь"[5].

Раўнапраўнасць моў на тэрыторыі Беларусі падчас ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі ставілася на першы план зусім невыпадкова. Насельніцтва нашага краю было шматнацыянальным. Каля 80 працэнтаў яго складалі беларусы, прыкладна па 8 працэнтаў — рускія і яўрэі, каля 2 працэнтаў — палякі, да 1 працэнта — украінцы. Жылі ў Беларусі літоўцы, немцы, татары, латышы, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў. Больш таго, беларусы насялялі пе-

[3] *История Советской Конституции: Сборник документов и материалов 1917-1956*, Москва 1957, с. 237.

[4] Там жа.

[5] Аляксандр Чарвякоў, *Я ніколі не быў ворагам. Выбраныя артыкулы і прамовы. Успаміны сучаснікаў*, Мінск 1992, с. 91-92.

раважна вёскі, рускія і яўрэі — гарады ды мястэчкі. У моўную сітуацыю гэта ўносіла спецыфіку: вёска была беларускамоўнай, горад — рускамоўны, так што дзяржаўная палітыка адносна раўнапраўнасці чатырох моваў была ў Беларусі выключна правільнай і адпаведнай рэальнасці сітуацыі.

Палітыка беларусізацыі напачатку дваццатых гадоў атрымала разуменне і мела поспех яшчэ і таму, што яе прызнавала і падтрымлівала і вышэйшае кіраўніцтва краіны. На X з'ездзе Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) у 1921 годзе ў адказ на крытычную заўвагу аб тым, што нібыта на Беларусі штучна ўводзіцца беларуская нацыянальнасць, Іосіф Сталін сказаў наступнае: „Гэта няправільна, таму што існуе беларуская нацыянальнасць, у якой ёсць свая мова, адметная ад рускай, з прычыны чаго ўзняць культуру беларускага народа можна толькі на роднай яго мове"[6]. Такое выказванне тады магло быць успрынята толькі як „каштоўнае ўказанне" — не менш!

Адкрыццё напачатку 1921 года курсаў беларусазнаўства пры Народным камісарыяце асветы БССР, якія ўзначаліў Язэп Лёсік; пераход справаводства на беларускую мову ў народных камісарыятах земляробства, асветы, замежных спраў; адкрыццё Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1921 год), Інстытута беларускай культуры (1922 год) — усё гэта стала станоўчымі момантамі на шляху да афіцыйнага прызнання беларусізацыі як дзяржаўнай палітыкі ў Беларусі. А тут яшчэ дзесяты і дванаццаты з'езды РКП (бальшавікоў), што прайшлі адпаведна ў сакавіку 1921 і красавіку 1923 гадоў, падтрымалі і замацавалі сваімі рашэннямі курс на абнаўленне нацыянальнай палітыкі на ўсёй тэрыторыі краіны. Дзеячы беларускага нацыянальна-вызваленчага руху актывізавалі сваю працу яшчэ больш. А калі ў ліпені 1923 года сумесным дэкрэтам ЦВК СССР і ЦВК БССР была аб'яўлена амністыя ўсім радавым удзельнікам і шэрагу кіраўнікоў антысавецкіх нацыянальных фарміраванняў і арганізацый перыяду 1918-1920 гадоў, рады актывістаў палітыкі беларусізацыі значна папоўніліся сталымі і вопытнымі прыхільнікамі беларускай нацыянальнай справы: В. Ластоўскім, Я. Лёсікам, С. Некрашэвічам, А. Цвікевічам.

Шмат і надзвычай плённа папрацавалі на беларусізацыю ў той час выдаўцы часопіснай, газетнай, кніжнай прадукцыі. Паводле падлікаў доктара гістарычных навук, прафесара Леаніда Лыча, у Беларусі выдавалася тады „9 беларускіх газет і часопісаў, працавала 10 беларускіх выдавецтваў, якія друкавалі масавымі тыража-

[6] *Десятый съезд РКП (б). Март, 1921 г. Стенографический отчет*, Москва 1963, с. 213.

мі падручнікі і творы мастацкай літаратуры на нацыянальнай мове"[7]. Дададзім, што менавіта ў тыя гады свае бліскучыя, поўныя аб'ектыўнасці і гістарычнай праўды па гісторыі Беларусі, мовазнаўстве, гісторыі беларускай літаратуры, геаграфіі апублікавалі Усевалад Ігнатоўскі, Уладзімір Пічэта, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Браніслаў Тарашкевіч, Сцяпан Некрашэвіч, Язэп Лёсік, Максім Гарэцкі, Вацлаў Ластоўскі, Аркадзь Смоліч і іншыя даследчыкі.

Новую беларускую літаратуру стваралі пісьменнікі і паэты, сярод іх — Цішка Гартны і Змітрок Бядуля, Янка Купала і Якуб Колас, Платон Галавач і Міхась Чарот. Яшчэ ў 1920 годзе Еўсцігней Міровіч стварыў Беларускі дзяржаўны тэатр, а Уладзіслаў Галубок — Трупу беларускіх артыстаў (так званы вандроўны тэатр).

Усе гэтыя і многія іншыя набыткі на ніве нацыянальна-культурнага будаўніцтва паспрыялі таму, што 15 ліпеня 1924 года другая сесія ЦВК БССР афіцыйна абвясціла беларусізацыю дзяржаўнай палітыкай. Прэзідыум ЦВК утварыў спецыяльную камісію па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі на чале з А. Хацкевічам. Такія ж дзяржаўныя ўтварэнні ствараліся пры акруговых выканкамах. Больш таго, для кантролю за сітуацыяй пры аддзеле прапаганды ЦК КП (бальшавікоў) Беларусі з'явіліся спецыяльныя бюро для работы сярод працоўных польскай, яўрэйскай, латышскай і літоўскай нацыянальнасцяў. Такім чынам, беларусізацыя як дзяржаўная палітыка станавілася трывалым грунтам для ўсенароднага ажыццяўлення ідэі нацыянальнага Адраджэння. Яна набывала характар цэласнасці і канцэптуальнасці, станавілася рэальнай партыйнай і дзяржаўнай справай, вызначальнай асаблівасцю грамадска-палітычнага развіцця Беларусі. Такой яна ўспрымалася ўсім беларускім народам незалежна ад нацыянальнасці таго ці іншага жыхара нашай Бацькаўшчыны.

Набыткі беларусізацыі пасля аб'яўлення яе дзяржаўнай палітыкай не прымусілі сябе доўга чакаць. Так, летам 1925 года праз курсы беларусазнаўства прайшлі перападрыхтоўку звыш тысячы настаўнікаў. Актыўна распачалася і прайшла беларусізацыя партыйных, дзяржаўных, савецкіх і грамадскіх органаў і арганізацый. Калі ў 1925 годзе ў цэнтральных дзяржаўных установах беларускай мовай валодаў толькі кожны пяты супрацоўнік (г.зн. 20 працэнтаў іх), дык у 1927 годзе ўжо кожныя чатыры з пяці (80 працэнтаў). З канца 1925 года пасяджэнні і пратаколы бюро ЦК КП (бальшавікоў) Беларусі і акруговых камітэтаў партыі вяліся на беларускай мове (для аналогіі: на працягу 1996-2000 гадоў

[7] „Маладосць", 1995, № 11, с. 188.

у парламенце Рэспублікі Беларусь ніводзін дэпутат не выступіў на роднай беларускай мове!).

Заслугоўвае ўвагі і той факт, што не было забыта і мясцовае насельніцтва. Асноўныя ўнутрырэспубліканскія дакументы друкаваліся на чатырох мовах: беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай; а агульнасаюзныя — на беларускай і рускай мовах. Кожны грамадзянін Беларусі меў права звяртацца ў любую дзяржаўную ўстанову на роднай мове і на ёй жа атрымаць адказ.

У 1928 годзе небывалых паказчыкаў як для таго часу, так і для наступных гадоў XX стагоддзя, дасягнула беларусізацыя ў галіне адукацыі. Да 80 працэнтаў школ было пераведзена на беларускую мову навучання. Паралельна з гэтым адчыняліся школы і класы з роднай мовай навучання для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў. І як вынік: выкладанне ў школах Беларусі вялося на васьмі мовах. Беларуская і руская мовы ва ўсіх навучальных установах з'яўляліся абавязковымі для вывучэння. На беларускай мове вялося выкладанне прадметаў і ў многіх прафтэхвучылішчах, тэхнікумах. У Беларусі дзейнічалі таксама польскі і яўрэйскі педагагічныя тэхнікумы.

Адным з галоўных накірункаў беларусізацыі з'яўлялася так званая каранізацыя — вылучэнне і выхаванне кадраў кіравання з карэннага насельніцтва. Ужо да канца 1925 года на партыйнай, дзяржаўнай, савецкай, прафсаюзнай і грамадскай рабоце працэнт беларусаў павялічыўся ў акругах — з 48-і да 63-х, у раёнах — з 75-і да 80-і, у сельскіх установах — з 84-х да 91-го працэнта. Прычым, вылучэнне і выхаванне тычылася не толькі беларусаў, але і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў, што насялялі Беларусь. У састаў раённых выканаўчых камітэтаў, напрыклад, уваходзілі звыш 8 працэнтаў яўрэяў, амаль 6,5 працэнта — рускіх, 2,6 працэнта — палякаў, 4,8 працэнта прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Яшчэ больш унушальна выглядалі гэтыя лічбы ў гарадскіх саветах: адпаведна 30; 12; 2,3 і 4 працэнты[8].

У згаданых вышэй рашэннях другой сесіі ЦВК БССР падкрэслівалася неабходнасць забяспечыць магчымасць выдзялення мясцовасцяў з пераважаючым яўрэйскім, польскім, латышскім, літоўскім і іншым насельніцтвам у самастойныя адміністрацыйныя адзінкі[9]. Задума была рэалізавана таксама: да 1928 года ў рэспубліцы налічвалася 23 яўрэйскіх, 19 польскіх, 16 рускіх, 5 латышскіх, 2 украінскія і 2 нямецкія Саветы.

На жаль, працэс беларусізацыі, які толькі-толькі набраў тэмп і знайшоў тысячы і тысячы новых прыхільнікаў і дарадцаў, неўзабаве пай-

[8] Аляксандр Чарвякоў, *Я ніколі не быў ворагам...*, с. 88.

[9] „Собрание узаконений и распоряжений БССР", Мінск 1924, № 11.

шоў на спад. Ужо з канца 1920-х гадоў у Беларусі, як і ў шэрагу іншых месцаў, пачынаецца жудасная, бесчалавечная па задуме і маштабах кампанія па выкрыцці так званага нацыянал-дэмакратызму. Кіраўнікам Савецкага Саюза ў Маскве, іхнім стаўленнікам на месцах, і ў прыватнасці — у Беларусі раптам пачалі ўяўляцца і мроіцца „варожая ідэалогія", „контррэвалюцыйныя плыні", што ўзнікалі нібыта з адной „мэтай" — рэстаўрацыі капіталізму. І бальшавікі распачынаюць актыўную барацьбу з гэтымі прывідамі.

Без барацьбы — жорсткай, крывавай — тады ў Беларусі не праходзіла нішто. Ідэя сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, абвешчаная Леніным, па-ранейшаму валодала мільёнамі сэрцаў і розумаў. А тут яшчэ „праслаўутае" абвастрэнне класавай барацьбы. І зноў, як і ў часы грамадзянскай вайны, палілася нявінная кроў.

Апагеем барацьбы бальшавікоў з т.зв. нацдэмаўшчынай стала сфальсіфікаваная напачатку 1930-х гадоў справа „Саюза вызвалення Беларусі". Па ёй органы АДПУ арыштавалі каля 200 самых выдатных дзеячаў беларускай нацыянальнай культуры, асветы, навукі і літаратуры. 104 чалавекі — і сярод іх два кіраўнікі народных камісарыятаў Антон Баліцкі і Зміцер Прышчэпаў — будуць неўзабаве асуджаны, а потым і фізічна знішчаны. У нацыянал-дэмакратызме абвінавачваліся нават Аляксандр Чарвякоў, Зміцер Жылуновіч, Усевалад Ігнатоўскі, Янка Купала, Якуб Колас і іншыя слынныя сыны нашай Бацькаўшчыны.

Пачынаецца адваротны працэс — згортванне беларусізацыі. Ужо ў 1931 годзе ЦК КП (бальшавікоў) Беларусі прымае пастанову „Аб узмацненні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытанні". А ў снежні 1933 года бальшавікі ставяць па-сутнасці кропку ў беларусізацыі як дзяржаўнай палітыцы, калі на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК КП(б) Беларусі адкрыта ўскладаюць „віну за зрыў беларусізацыі на нацыянал-дэмакратаў". І зноў арышты, катаванні, ссылкі, расстрэлы. Пад шыльдай ліквідацыі нацдэмаўшчыны былі знішчаны ці накіраваны ў сталінскія ГУЛАГі ўсе больш-менш вядомыя вучоныя і дзеячы культуры, мастакі і кампазітары, артысты і журналісты, краязнаўцы і настаўнікі, студэнты і проста адукаваныя і неадукаваныя грамадзяне. Толькі пісьменнікаў было рэпрэсіравана звыш 230 чалавек!

Дваццатыя гады, што прайшлі на Беларусі пад знакам беларусізацыі, справядліва лічацца беларускім рэнесансам. Былі адкрыты і ўсталяваны вялікія перспектывы пашырэння і паглыблення нацыянальнай культурна-дзяржаўнай палітыкі — новай па характары і змесце, вывучэнні і развіцці. На жаль, яна была проста задушана, фізічна ліквідавана.

Справы ж свядомых, шчырых і праведных змагароў за свой народ, якія бачылі свой край абноўленым, па-сапраўднаму культурным і цывілізаваным, засталіся. І яны, несумненна, рана ці позна, але будуць запатрабаваны. Бо рана ці позна Беларусь захоча ўсё ж адрадзіцца, адчуць сябе роўнай у Еўропе.